БРЫЛЕЎСКІ ЛЕТАПІС

№ 6 (88)
люты
2009 г.

ІНФАРМАЦЫЙНА - ГРАМАДСКІ БЮЛЕТЭНЬ

Выдаецца з мая 2006 г.

Шляхамі абаронцаў

с.4-5

Улада с.2

Сустрэча с.6

Легенда с.8

KAMUNAT.org

Галоўнае пытанне

26 лютага 2009 г. адбылося чарговае паседжанне выканкама Брылеўскага сельскага Савета. Старшыня выканкама Уладзімір Ільіч Мажораў абвесціў павестку дня, дзе галоўным пытаннем было выкананне зямельнага заканадаўства на тэрыторыі сельсавета.

К.А.Новікава

У.І.Мажораў

Землеўпарадчык сельсавета Кацярына Аркадзьеўна Новікава ў сваёй справаздачы адзначыла, што зямельныя пытанні -- самыя важныя на сёняшні дзень. У Брылеўскім сельсавеце ў рысе 10 населеных пунктаў маецца 517 га зямлі, замацаваных за выканкамам. З іх 338,25 га занятыя над пасевамі, а 179 га займаюць будынкі, дарогі, сенажаці, выганы і г.д. Грамадзянамі зарэгістраваны 158 га, і работа ў гэтым накірунку вядзецца. У прыватнай уласнасці знаходзіцца 25 участкаў агульным памерам 3,96 га. Па пытаннях землеўпарадкавання летась ў выканкам звярнулася 105 чалавек. На будаўніцтва жылых дамоў у 2008 г. не было ні адной заявы. Маецца 4 участка, аддадзеных у арэнду замежным грамадзянам, і 1 участак выкарыстоўвае прадпрымальнік. Усе землекарыстальнікі павінны эфектыўна працаваць на зямлі, выконваючы мерапрыемствы па павышэнню яе ўрадлівасці.


А.М.Яцкова

Н.І.Рамашкевіч

Асноўныя землекарыстальнікі -- УКАП "Фірма "Днепр" (3.600 га) і СПК "Макаранцы" (3.500 га). Пустаючых земляў амаль няма. Але ўчастак 8 га па дарозе на Брылі, які быў перададзены фірме "Днепр", да гэтага часу пустуе і зарастае бур'яном. Па розных абставінах маецца шмат пустуючых участкаў на тэрыторыях вёсак. Сельвыканкам не мае магчымасці іх апрацоўваць, а гаспадаркам на зямельных кавалках ад 0,15 да 0,50 га працаваць эканамічна немэтазгодна. Мэтанакіраваная праца па выкананню зямельнага заканадаўства будзе працягнута і надалей.

В.В.Маскалёў

А.М.Сілкоў

Старшыня селькама в.Брылі Тамара Васільеўна Максімчыкава звярнула ўвагу на стыхійныя сметнікі каля вёсак. У.І.Мажораў адказаў, што зараз экалагічныя службы будуць выдаткоўвацца сродкі на ліквідацыю такіх сметнікаў.

Прадстаўнік Брылеўскай школы-сада Тамара Мікалаеўна Маісеенка папрасіла заняцца пытаннямі водазабяспячэння жыхароў вуліцы Садовай у Брылях, бо вадаправодная вада зусім нягодная для ўжывання. У.І.Мажораў паведаміў, што гэтае пытанне будзе вырашацца з ЖКГ.

Па абмеркаванаму пытанню была прынята адпаведная пастанова.

Сакратар выканкама Надзея Іванаўна Рамашкевіч азнаёміла прысутных аб мерах, якія прымаюцца ў Магілёўскай вобласці па выкананню Дырэктывы №1 па ўмацаванню грамадскай бяспекі і дысцыпліны.

М.Я.

Т.М.Маісеенка

Імгненні зімы

Фотаздымкі Міколы Яцкова

Лесвіца ў неба

Снегавыя "брылі"

"А нам і тут добра!..."

Моцныя, хут

23 лютага 2009 года ў Брылеўскім Доме культуры адбылася спартыўная конкурсна-гульнёвая праграма "А ну-ка, хлопцы!" Былі розныя спаборніцтвы і конкурсы. Быў добры настрой усіх удзельнікаў. І галоўнае -- было адчуванне, што брылеўскія хлопцы маюць усе падставы, каб у пазначаны час паспяхова прайсці суровую армейскую школу. А потым з гонарам і годнасцю несці па жыцці высокае званне абаронца Айчыны.

Мікола ЯЦКОЎ.
Фотаздымкі аўтара.

Каманды, на старт!

Складанае пытанне...

Арбітры спаборніцтваў Зміцер Васюрэнка і Уладзіслаў Шабан

Карына Бірукова



Яна Какоўка

Ала Яцкова: *"А зараз уважліва паслухайце заданне!"*



Па-пластунскі...

Сяргей Бураеў кіруе будаўніцтвам самалётаў

А што ж тут зашыфравана ў данясенні?..

Вячаслаў Меляшкоў

кія, кемлівыя

Балельшчыкі -- Юлія Сяргееўна Ермалаева і Марына Міхайлаўна Бірукова

Самалёты рыхтуюцца да палёту

Уладзіслаў Шабан -- Кастусю Пятрову: *"Колькі колаў павінна быць у танка?"*

Цягнуць канат дапамагалі ўсе

Спаборніцтва па кідках на меткасць

З гантэлямі Сяргей Бураеў і Зміцер Васюрэнка

Адціснуцца ад падлогі: хто больш?

Вось яны, нашы ўдзельнікі *(злева направа):* Карына Паршнёва, Аляксей Паршнёў, Арцём Пухоўскі, Марына Пухоўская, Вячаслаў Меляшкоў, Уладзіслаў Шабан, Кастусь Пятроў, Ганна Ермалаева, Зміцер Васюрэнка, Кірыл Куляшоў, Аляксей Аляксейкоў, Сяргей Бураеў, Антон Трухмінаў, Ала Міхайлаўна Яцкова, Аляксандр Бураеў, Яна Какоўка, Варвара Какоўка, Карына Бірукова, Аксана Міхайлаўна Куляшова, Кастусь Пшанічны, Надзея Журава.

Узнагароды знайшлі сваіх героеў

Літаратурная старонка

Гучалі вершы і песні

27 лютага 2009 года ў магілёўскай абласной бібліятэцы імя У.І.Леніна адбылася літаратурна - музычная вечарына, прысвечаная 95-годдзю з дня нараджэння А.Куляшова. Аб сваім стаўленні да паэта выказалася вядомая беларуская паэтэса Раіса Баравікова. Сваю “Восеньскую песню” на верш А.Куляшова праспяваў Мікола Яцкоў. А напрыканцы вечарыны для Р. Баравіковай быў падрыхтаваны сюпрыз: Мікола і Ала Яцковы выканалі некалькі песен на вершы Раісы Андрэеўны. І ў дадатак гэтыя песні былі ёй уручаны ў выглядзе кніжкі і дыска з назвай “Вяртанне”. Паэтэтэса выказала падзяку і пажадала і надалей супрацоўнічаць з брылеўскімі музыкамі.

Аліна САВІЦКАЯ.

Выступае Раіса Баравікова

Уважлівыя слухачы

Фотаздымкі Алы Яцковай і прэс-службы бібліятэкі

Спявае Мікола Яцкоў

Аўтограф ад паэтэсы

"Ночь темна, земля бела - февраль..."

Стихи Елены АЛДАНОВОЙ

* * *

Ночь темна, земля бела – февраль.
Нет тебя, в душе печаль –
как жаль.
Знаю я – любовь ко мне придёт,
В мае снова ландыш зацветёт,
Лето луговой травой шепнёт,
Осень золотым дождём сыпнёт...

Снова ночь темна – опять февраль.
Нет тебя, в душе печаль –
как жаль.
Мыслей и надежд круговорот,
Что ушло, то вновь опять придёт.

* * *

В одном дворе,
Неважно где,
Жил мальчуган Серёга.
Любил он девочку одну,
Анютку-недотрогу.
И в снах, и в дождь
Бежал он к ней,
Цветы в руке сжимая.
С улыбкой, с трепетом в душе
Ждала его родная.
И целовал её глаза
Дрожащими губами.
И звук души,
И сердца стук
Он слушать мог часами…
А девочка росла, цвела,
Анютка-недотрога,
Сама цветочком стала вдруг, --
Зачем теперь Серёга?
И звук души.
И сердца стук –
Забыла всё родная.
И закружилась, понеслась
Девчонки жизнь лихая…
Прошла уж не одна весна,
Пока остановилась.
Пришло раскаянья, ан нет –
Ты поздно спохватилась.
При встреча говорит:
«Прости!»
Дрожащими губами,
Глаза Анюткины блестят
Печальными слезами…

Брылеўская бібліятэка інфармуе...

Планета семья

№ 5, 2008

Паэтэса Таццяна РУДЭНКА адзін з сваіх вершаў прысвяціла матулі:

МАМИНА ШАЛЬ

Когда наступит зимний вечер,
В душе поселится печаль,
Возьму и наброшу на плечи
Пуховую мамину шаль.
И вспомнятся мамины руки –
Их нежность и теплота.
Забыть, чтоб сердечные муки,
Творили они чудеса.
Спасибо тебе, дорогая,
За эту прекрасную шаль!
Теплом твоих рук согревая,
Прогонит из сердца печаль.

Цытата

Три вещи никогда не возвращаются обратно:
Время, слово, возможность.
Три вещи не следует терять:
Спокойствие, надежду, честь.
Три вещи в жизни наиболее ценны:
Любовь, убеждения, дружба.
Три вещи в жизни никогда не надежны:
Власть, удача, состояние.
Три вещи определяют человека:
Труд, честность, достижения.
Три вещи разрушают человека:
Вино, гордыня, злость .

P.S. Но иногда пока все поймешь, пройдет целая жизнь

Вестник

10.12.2008 г.

Як мы ведаем, у Магілёве была аднаўлена старажытная Ратуша -- сімвал Магдэбургскага права і гарадскога самакіравання. У гонар гэтай падзеі ў Магілёве ўбачыла свет кніга вядомых гісторыкаў А.Агеева і А.Трусава "Магілёўская Ратуша". Вось некаторыя цікавыя звесткі з гэтага выдання:

- Апошнім, на ўсход ад Магілёва, горадам, які меў ратушу, быў Смаленск (уваходзіў у 1404-1514 г.г. у Вялікае княства Літоўскае). Менавіта там тады заканчвалася Еўропа.
- У беларускіх "магдэбургскіх" гарадах ніхто ніколі не насіў лапці. Нават жабракі, якія, дарэчы мелі ў Магілёве свайго, прызначанага магістратам, старасту. І кожны гараджанін павінен быў мець сваю зброю.
- Януш Радзівіл (1612 - 1655), палкаводзец і гетман ВКЛ, называў Магілёў сталіцай бунтаў на Літве.
- Нават архіепіскапа Магілёўскага і Беларускага Георгія Каніскага (правіў у 1755 - 1795 г.) магілёўцы запрашалі з Кіева і выбіралі на высокую пасаду самі.
- Пры будаўніцтве ратушы толькі жалезных цвікоў было выкарыстана дваццаць тыпаў.
- У 1980 г. непадалёк ад ратушы, на Савецкай плошчы, былі знойдзены рэшткі даўніх драўляных маставых з бярвенняў. Гэта яшчэ адно пацверджанне: у сярэднявеччы Магілёў быў вельмі добраўпарадкаваным на той час горадам.

ЗВЯЗДА

7.02.2009 г.

БЫЦЬ БЯДЗЕ?

- Лічылася, што калі чалавек дакладна чуў, як яго паклікалі па імені, але пры гэтым не бачыў таго, хто яго клікаў, гэта душы продкаў даюць знак збірацца да іх.
- Дрэнным прадказаннем лічыўся сон, у якім чалавека клічуць "да сябе" памерлыя раней сваякі ці знаёмыя.
- Хуткую смерць прадказвала лясная птушка (варона, сава, пугач), якая залятала ў вёску. Калі яна сядала на страху хаты, чакалі смерці гаспадара той хаты; калі яна сядала на дрэва ці царкву (нічыё месца), чакалі мор, эпідэмію ці іншыя нягоды.
- Калі птушка (часцей за ўсё ластаўка) рэзка грукне ў ваконную шыбу ці заляціць у хату -- чакалі смерці сярод хатніх.
- Сабака доўга вые, апусціўшы галаву да зямлі, ці вырыў у садзе вялікую яміну -- чакай няшчасця.
- Калі ў хаце пасяліўся конік і стаў гучна стракатаць, гэта значыць, што ён "выжывае" гаспадароў з хаты.
- Прадказаннем смерці была і нечакана разбітая ў хаце ікона.
- Калі на толькі што засланым абрусе пасярэдзіне ўтваралася складка ў выглядзе ромба, таксама чакалі самага дрэннага.
- Сон, у якім у чалавека выпадае зуб з крывёю, прадказваў пахаванне ў хаце.

Прыкметамі яшчэ адной смерці ў хаце лічылася:

- калі труна для памерлага зроблена не па яго памерах (замалая ці завялікая);
- калі ногі памерлага доўгі час застаюцца цёплымі;
- калі чалавек памёр з аткрытымі вачыма.

АД БОЯЗНІ СМЕРЦІ

Ёсць людзі, якія вельмі пакутуюць з-за свайго страху смерці. Каб пазбавіць іх ад гэтага, трэба ўзяць тры шчэпаці шэрага маку, абсыпаць галаву гэтага чалавека і замовіць: ***"Анёл мой зямны, будзь са мной, Божай рабой (імя). Здымі страх смерці зброей вечнага жыцця, імем Бога. Амін".***

Прозвішча падпісчыка

Калі камяні пачнуць размайляць...

Вось яны -- царскія сляды!

Ўвёсцы Макаранцы Брылеўскага сельсавета знаходзіцца ўнікальны камень з паглыбленнямі на паверхні, нагадваючымі адбіткі чалавечых ног. Такія камяні называюць *"следавікамі"*, і яны вельмі шануюцца ў народзе. Што тычыцца макаранскага следавіка, то тут здаўна існуе легенда, што гэтыя сляды пакінуў рускі цар Пётр I, калі ў 1708 годзе ішоў з войскам праз туташнія мясціны у бок вёскі Лясная, дзе адбылася бітва з войскам шведскага караля Карла XII. Як казалі дзяды і прадзеды, Пётр узняўся на гэты камень, каб паглядзець удалячынь, і на паверхні адціснуліся сляды ягоных батфортаў.

А што кажа гісторыя наконт такой з'явы, як камені - следавікі? Давайце пагартаем пажоўклыя старонкі...

"...В "Истории государства Российского" Н.М.Карамзин писал: "Памятником каменносечного искусства древних славян остались большие гладкие плиты, на которых выдолблены изображения рук, пят, копыт и прочее". Поэт-декабрист Ф.Н.Глинка в своём тверском имении собрал целую коллекцию загадочных камней. Местные жители называли, к примеру, следы человеческих ног на валунах чертовыми следами или следами Сатаны. А в других районах - Христовыми следами, стопами Богородицы. Несмотря на тысячелетнее христианство, на Руси до сих пор сохранились многие языческие обряды и обычаи. Сельские жители считают камни-следовики священными и целебными, а если такой камень лежит у края водного потока, то и вода эта почитается как "живая", чудодейственная. Еще в конце прошлого века валунам-следовикам крестьяне приносили жертвоприношения в виде лепешек, яиц и даже денег.

В преданиях рассказывается о том, что в начале творения Сатана нырнул и достал Камень со дна моря. Господь разломил его надвое, одну половину оставил себе, а вторую отдал Сатане; после этого Бог ударил о камень и из искр, вылетевших из него, появились ангелы; когда Сатана проделал то же, из искр появились бесы.

Помнік ахвярам Халакоста ў Магілёве

По белорусским поверьям, мужчина рождается на камешке, а женщина на черепке, поэтому если в земле под супружеской постелью лежит Камень, то супруга беременеет мальчиком, а если черепки битой посуды, то девочкой. В фольклоре и мифологии Камень осмысляется как некая основа, центр мира или замок, скрепляющий небо и землю"

Такая вось гісторыя. А старажытныя матывы выкарыстоўваюць сучасныя творцы -- як, напрыклад, магілёўскі скульптар Андрэй Вараб'ёў, які зрабіў помнік ахвярам Халакосту ў выглядзе каменя-следавіка.

Ала ЯЦКОВА,
бібліятэкар Брылеўскай бібліятэкі.

Фотаздымкі М.Яцкова.

Інфармацыйна-грамадскі бюлетэнь для жыхароў Брылеўскага рэгіёна і наваколля.
Распаўсюджваецца бясплатна.
Наклад 100 асобнікаў.

Адрас для карэспандэнцыі:
213107 Магілёўскі раён п/а Брылі
тэл. маб. +375293732886
e-mail: brylibelarus@gmail.com
© "Брылеўскі летапіс", 2009

Заснавальнік і рэдактар
Мікола ЯЦКОЎ